# ВОПЫТ, ГОДНЫ ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

## Кіраўнік дзяржавы з рабочым візітам наведвае Казахстан

**Беларусі цікавы вопыт Казахстана па будаўніцтве выставачных павільёнаў для правядзення міжнароднай спецыялізаванай выставы «ЭКСПА-2017». Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора ў Астане падчас двухбаковай сустрэчы з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым.**

«Мы не маглі не наведаць гэтую выставу, бо вы — нашы сябры, блізкія людзі, і я ведаю, як вы рыхтаваліся да гэтай выставы, колькі зроблена. Мы не проста будзем глядзець павільёны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што нядаўна ў Мінску былі знесены старыя выставачныя плошчы. «Мы спланавалі будаўніцтва беларускай выставы. Таму будзем старанна вывучаць ваш вопыт. Вядома, нам такая маштабнасць не патрэбна — гэта сусветная выстава. Мы вельмі ўважліва вывучым гэты вопыт, і калі вы нам дапаможаце хоць бы архітэктурнымі праектамі, спецыялістамі, і падкажаце, мы вам будзем вельмі ўдзячныя», — адзначыў беларускі лідар.

У сваю чаргу Нурсултан Назарбаеў падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за тое, што ён прыняў запрашэнне прыехаць у Казахстан для ўдзелу у саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і ў адкрыцці міжнароднай спецыялізаванай выставы «ЭКСПА-2017». Нурсултан Назарбаеў таксама падкрэсліў, што Беларусь на «ЭКСПА-2017» прадстаўлена асобным нацыянальным павільёнам. Па яго словах, Беларусі ёсць што паказаць па новай тэхніцы і тэхналогіях.

* * *

Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з казахстанскім калегам перадаў яму копіі архіўных дакументаў, выяўленых органамі дзяржбяспекі Беларусі, у дачыненні да асуджаных у БССР у канцы 1930-х гадоў па палітычных матывах і этапаваных у лагер на тэрыторыі Казахстана жанчын. Дакументы прызначаны для Музейна-мемарыяльнага комплексу памяці ахвяр палітычных рэпрэсій і таталітарызму, які размешчаны на месцы найбуйнейшага савецкага жаночага лагера — Акмолінскага спецаддзялення Карлага НКУС СССР, больш вядомага як Акмолінскі лагер жонак здраднікаў Радзімы (Алжыр).

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Нурсултан Назарбаеў шмат увагі ўдзяляе аднаўленню аб'ектыўнасці гісторыі і гістарычнага працэсу. Кіраўнік нашай дзяржавы расказаў, што калі даведаўся аб рэалізацыі ідэі па стварэнні музейна-гістарычнага комплексу на месцы былога лагера недалёка ад Астаны, то даручыў КДБ Беларусі знайсці і вывучыць архіўныя матэрыялы, бо ў лагер высылаліся людзі з самых розных рэспублік былога СССР.

«Мы знайшлі цікавыя матэрыялы. Думаю, яны паслужаць асновай нашай беларускай выстаўкі ў гэтым музеі», — выказаў надзею Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, перадаваемыя дакументы — копіі спраў у дачыненні да жонак беларускіх пісьменнікаў, лісты сваякоў рэпрэсаваных жанчын. Сярод іх — і цешча народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Блізкая ўлада

# ГАЛОЎНАЕ — АТРЫМАЦЬ РАБОТУ

## Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Брэсцкай вобласці Васіль ГЕРАСІМАЎ разам з членам Савета Рэспублікі Віктарам Чайчыцам правялі сумесны прыём грамадзян у Белаазёрску Бярозаўскага раёна

**Яшчэ да пачатку прыёму Васіль ГЕРАСІМАЎ сказаў журналістам, што месца выязнога мерапрыемства было выбрана не выпадкова. Менавіта ў Кобрынскім і Бярозаўскім раёнах самая складаная сітуацыя ў вобласці па беспрацоўі. Таму гэтым рэгіёнам і ўдзяляецца павышаная ўвага. Як і чакалася, абсалютная большасць тых, хто прыйшоў у прызначаны час, прасілі паспрыяць з працаўладкаваннем.**



Гісторыі некаторых заяўнікаў можна назваць у многім тыповымі. Маладыя людзі спрабавалі зарабіць грошы на жыццё за межамі краіны. Там не вельмі атрымалася, вярнуліся дадому і шукаюць працу тут. Усё гэта датычыцца маладога мужчыны, які прыйшоў на прыём першы. Аказалася, ён мае сельскагаспадарчую адукацыю, пасля ВНУ адпрацаваў па размеркаванні ў Магілёўскай вобласці, потым стварыў сям'ю. Думаў зарабіць грошай у Расіі на ўладкаванне побыту, але атрымаў траўму, вярнуўся дадому. Кіраўнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Бярозаўскага райвыканкама прапанавала мужчыну пазнаёміцца з вакансіямі вадзіцеляў. Адразу з прыёму ён накіраваўся да работадаўца.

Такая ж праблема прывяла ў гарвыканкам і дзяўчыну, педагога па адукацыі. Яна працавала пэўны час па спецыяльнасці, а потым спакусілася на вялікія заробкі ў Польшчы. Насамрэч за мяжой плацілі не так, як абяцалі, і жыхарка Белаазёрска вярнулася дадому. Работы па спецыяльнасці тут не аказалася. Саіскальніцы падказалі пра 20 вакансій швей, якія адкрыліся на новым прадпрыемстве. Яна абяцала падумаць.

59-гадовы Васіль Васілевіч скардзіўся, што работадаўцы не хочуць браць з-за ўзросту, а прадпрыемства, дзе ён працаваў раней, часта прастойвала, таму заробкі былі вельмі нізкія. У грамадзяніна дзіця атрымлівае адукацыю платна, ды і будучую пенсію трэба зарабляць. Была на прыёме і мама, якая хадайнічае за сына-юрыста. Але склалася ўражанне, што 30-гадовы сын сам не вельмі ахвотна шукае работу, больш гэтае пытанне хвалюе маці.

Яшчэ адна маладая асоба не мае вопыту работы па атрыманай у камерцыйнай навучальнай установе спецыяльнасці, але мае вельмі вялікія амбіцыі. Работу на транспарце, у гандлі, якую ёй раней прапаноўвалі, яна не палічыла дастойнай увагі, а на малочным прадпрыемстве, дзе заяўніца хацела б працаваць, вакансій не аказалася. Тут ужо маем выпадак, калі чалавек сам павінен праяўляць большую актыўнасць. Калі ёсць жаданне працаваць толькі па абранай спецыяльнасці, такую магчымасць варта пашукаць у іншым горадзе.

На прыёме былі таксама старшыня Бярозаўскага райвыканкама Леанід Мартынюк, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне раёна Маргарыта Талкун. З большасцю грамадзян — удзельнікаў прыёму яны ўжо сустракаліся раней, і гэтым разам кожнаму чалавеку падрабязна расказвалі аб тых магчымасцях і вакансіях, якія ёсць у раёне.

Былі падчас прыёму і іншыя пытанні. Так, пенсіянер Сяргей Мартысевіч расказаў пра канфлікт мясцовых рыбакоў і адпачывальнікаў з рыбгасам. Рэч у тым, што ранейшы мост, праз які хадзілі і ездзілі людзі, цяпер аказаўся на тэрыторыі рыбнай гаспадаркі, якая праход закрыла. Людзі засталіся незадаволеныя тым, што даводзіцца абыходзіць кіламетр ці больш, каб дабрацца да месца адпачынку, сабралі подпісы, звярнуліся ў райвыканкам. Мясцовая ўлада іх падтрымала. Але ў рыбгаса свая праўда, гаспадарнікі лічаць, што праход могуць скарыстаць браканьеры, злодзеі, вакол жа ўстаноўлены помпы і іншае дарагое абсталяванне. Перапіска доўжыцца працяглы час, але да гэтай пары вырашэнне праблемы знайсці не ўдавалася. Пасля прыёму памочнік Прэзідэнта выехаў на месца, і каля спрэчнага аб'екта дамовіліся з кіраўніцтвам рыбгаса адкрыць мост на перыяд актыўнага адпачынку грамадзян. За гэты час рыбгас правядзе маніторынг. Службовыя асобы вывучаць, хто і як ходзіць па тым мосце. Пасля гэтага будзе прынятае канчатковае рашэнне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Бярозаўскі раён*

■ Супрацоўніцтва

# Добрая адзнака

**Патэнцыял інвестыцыйных магчымасцяў Еўрасаюза ў Беларусі пакуль што выкарыстоўваецца не ў поўнай меры, у тым ліку ў транспартна-лагістычнай сферы. Пра гэта заявіў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, падчас міністэрскай канферэнцыі па тэматыцы ўзаемасувязяў і сумяшчальнасці ў рэгіёне Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы «Наводзячы масты паміж Еўропай і Азіяй».**

«Мы спадзяёмся, што ўзаемадзеянне Беларусі з сумежнымі еўрапейскімі краінамі і міжнароднымі фінансавымі структурамі ў галіне транспарту дазволіць правесці мадэрнізацыю прыгранічнай транспартнай інфраструктуры і ліквідаваць вузкія месцы на гэтых участках шляху, якія стрымліваюць транспартныя патокі. Цеснае ўзаемадзеянне таксама паспрыяе рэканструкцыі аўтамабільных магістраляў міжнародных транспартных калідораў і павысіць хуткасць перамяшчэння па іх», — паведаміў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік Саўміна таксама адзначыў, што патэнцыял інвестыцыйных магчымасцяў Еўрасаюза ў Беларусі пакуль што выкарыстоўваецца не ў поўнай меры. Пэўныя магчымасці ў плане прыцягнення еўрапейскіх фінансавых рэсурсаў у Беларусь для рэалізацыі праектаў у транспартна-лагістычнай сферы могуць адкрыцца ў выпадку прыняцця прапанаванага Еўракаміссіяй плана знешніх інвестыцый, а таксама ўдзелу ў ініцыятыве «Злучаючы Еўропу».

У сваю чаргу **намеснік генеральнага сакратара ЦЕІ Маргот КЛЕСЦІЛЬ-ЛЕФЛЁР** зазначыла, што арганізацыя гатова і далей развіваць супрацоўніцтва, паляпшаць інвестыцыйны клімат у рэгіёне. «Я хацела б выказаць сваю ўдзячнасць беларускаму старшынству ў ЦЕІ за выдатную работу, якая праводзіцца», — дадала яна.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Багдановіч у Мадрыдзе

## Зборнік твораў беларускага класіка на іспанскай мове прэзентуюць у сталіцы Іспаніі

**Трэці Беларуска-Іспанскі бізнес-форум пройдзе на наступным тыдні ў Мадрыдзе. У яго адкрыцці прыме ўдзел міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей. Пра гэта на брыфінгу паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый Міронечык.**

Цэнтральным мерапрыемствам візіту кіраўніка знешнепалітычнага ведамства стане правядзенне перагавораў з міністрам замежных спраў Іспаніі. Да таго ж запланаваны сустрэчы з прадстаўнікамі заканадаўчай і выканаўчай улады Іспаніі, дзелавых колаў, а таксама падпісанне двухбаковых пагадненняў. Такая шырокая праграма накіравана на інтэнсіфікацыю двухбаковых адносін, у тым ліку дзеля прыцягнення інвестыцый, а таксама на развіццё супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам у цэлым.

Падчас візіту Уладзімір Макей прыме ўдзел і ў прэзентацыі зборніка перакладаў твораў Максіма Багдановіча на іспанскую мову, а таксама правядзе сустрэчу з прадстаўнікамі беларускай дыяспары.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Пяткевіч Наталлі Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Парламенцкія выбары ў Вялікабрытаніі



Датэрміновыя парламенцкія выбары прайшлі ў чацвер у Вялікабрытаніі. Роўна ў 7:00 па мясцовым часе больш за 40 тысяч выбарчых участкаў адкрылася па ўсёй краіне. Магчымасць прагаласаваць у 46,4 млн брытанцаў, якія зарэгістраваліся ў якасці выбаршчыкаў, была да 22:00 (00:00 па Мінску). Адразу пасля гэтага вядучыя тэлеканалы абвясцілі вынікі экзітполаў, падлік галасоў вёўся ўсю ноч, а канчатковыя вынікі павінны былі стаць вядомыя да раніцы пятніцы, 9 чэрвеня.

Па выніках выбараў будзе вызначаны новы склад Палаты абшчын, куды ўваходзіць 650 дэпутатаў (па колькасці выбарчых акруг). Партыя, якая набярэ больш за палову дэпутацкіх мандатаў, атрымае права сфарміраваць урад. Асноўная інтрыга заключаецца ў тым, ці зможа кіруючая кансерватыўная партыя, якую ўзначальвае прэм'ер-міністр Тэрэза Мэй, утрымаць дзяржаўнае стырно ў наступныя пяць гадоў.

Апытанні грамадскай думкі паказваюць перавагу кансерватараў, аднак роскід у ацэнках вельмі вялікі.

## Губернатар Нью-Ёрка прапанаваў Трампу пачаць з яго дэпартацыю імігрантаў

Эндру Куома падкрэсліў, што ўсе ньюёркцы з'яўляюцца імігрантамі, у тым ліку і сам кіраўнік дзяржавы.

Губернатар штата Нью-Ёрк Эндру Куома, дзед якога перасяліўся ў Злучаныя Штаты з Італіі, прапанаваў прэзідэнту Дональду Трампу рызыкнуць дэпартаваць і яго асабіста ў адпаведнасці з указамі аб узмацненні жорсткасці іміграцыйнага рэжыму ў ЗША. Губернатар, які, як і Трамп, нарадзіўся ў



нью-ёркскім раёне Куінсі, нагадаў кіраўніку дзяржавы: «Ньюёркцы ведаюць, што ўсе мы з'яўляемся імігрантамі. І ты, мой сябра, таксама ім з'яўляешся», — заўважыў Куома. «Ты хочаш дэпартаваць імігрантаў? Пачні тады з мяне, бо я лічу сябе імігрантам», — заявіў губернатар штата.

Раней федэральныя суды ўжо двойчы выносілі рашэнні аб блакіраванні ўказаў Трампа аб узмацненні жорсткасці мер у сферы іміграцыі. Адносна ўказа, які ўводзіў 90-дзённую забарону на ўезд у ЗША грамадзянам з сямі мусульманскіх краін (Іран, Ірак, Лівія, Самалі, Судан, Сірыя і Емен), такое рашэнне вынес федэральны суд у Сіэтле (штат Вашынгтон), а калі былі ўнесены змяненні (са спіса выключылі Ірак), указ блакіраваў федэральны суд у Ганалулу (штат Гаваі).

## Рада прагаласавала за прыярытэтнасць уступлення Украіны ў НАТА

Украінскі парламент вырашыў, што ўступленне Украіны ў НАТА з'яўляецца прыярытэтам у знешняй палітыцы. Адпаведны законапраект падтрымалі 276 дэпутатаў пры 226 неабходных.

Парламентарыі ўнеслі змяненні ў законы «Аб асновах унутранай і знешняй палітыкі» і «Аб асновах нацыянальнай бяспекі Украіны», замацаваўшы на заканадаўчым узроўні палажэнне аб гэтым прыярытэце. Раней генеральны сакратар арганізацыі Енс Столтэнберг заявіў, што нягледзячы на рашэнне Рады аб адмове ад пазаблокавага статусу Украіны, гэтая дзяржава яшчэ вельмі не хутка зможа стаць членам НАТА.